Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

_____________ Ю.П. Голубеў
«25» 06 2019 г.
Рэгістрацыйны № УД - 418/19 /уч.

# КАНФЕСІЙНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ X–XVIII СТАГОДДЗЯЎ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:
1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)»,
напрамак спецыяльнасці 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)»

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21 03 01-2013 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)», рэгістрацыны № 17-13/вуч. ИФФ от 29.08.2013.

СКЛАДАЛЬНІК:
Віктар Уладзіміравіч Чараўко, старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», магістр гістарычных навук.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай гісторыі і турызму ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»
(пратакол № 9 ад «27» мая 2019 г.)

Метадычнай камісіяй гуманітарнага факультэта ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»
(пратакол № 10 ад «25» чэрвеня 2019 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі. «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» з’яўляецца вучэбнай дысцыплінай цыкла спецыяльных дысцыплін, адносіцца да кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі і вывучаецца па выбару студэнта.

«Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» уяўляе сабой вучэбную дысцыпліну, прысвечаную разгляду рэлігійных працэсаў на Беларусі ў X–XVIII стст. Выбар храналагічных рамак абумоўлены наступнымі меркаваннямі. X ст. — час інтэнсіўнага развіцця комплекса язычніцкіх вераванняў і выключна актыўнага ўздзеяння дзяржавы на канфесійную сферу, пачатак пашырэння хрысціянства як дзяржаўнай рэлігіі. Верхняя храналагічная мяжа прыпадае на XVIII ст. – перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай, калі адбыўся дэмантаж сістэмы рэлігійных адносін, сфарміраваных да гэтага, і ўключэнне беларускіх зямель у сістэму канфесійных адносін Расійскай імперыі.

Вылучэнне канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст. у асобны прадмет азначае не разгляд гісторыі рэлігійных плыняў паасобку, а комплекснае іх вывучэнне ў кантэксце агульнанацыянальнай гісторыі. Гэта дае магчымасць выходзіць за адносна вузкія рамкі гісторыі кожнай асобна ўзятай канфесіі, бачыць узаемны ўплыў рэлігійных плыняў і ўздзеянне на іх з боку дзяржавы, тлумачыць падзеі і з’явы з надканфесійных пазіцый. У выніку атрымліваецца цэласны малюнак унутры-, міжканфесійнага і царкоўна-дзяржаўнага ўзаемадзеяння, якое мела месца на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях.

З’яўляючыся асобнай дысцыплінай, тэматычна «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» ўяўляе раздзел айчыннай гісторыі. Таму вывучэнне дысцыпліны спрыяе больш поўнаму засваенню гісторыі Беларусі праз паглыбленае вывучэнне такога важнага аспекта айчыннай гісторыі, як рэлігійная гісторыя. Для вырашэння пастаўленых задач у межах «Канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў» актуалізуюцца і сістэматызуюцца веды, атрыманыя студэнтамі пры вывучэнні сумежных дысцыплін, даецца тэарэтычная база для аналіза гістарычных фактаў. Атрыманыя веды могуць быць з плёнам выкарыстаны студэнтамі пры напісанні курсавых і дыпломных работ па гісторыі Беларусі.

Акрамя гісторыі Беларусі, «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Гісторыя сярэдніх вякоў», «Гісторыя новага часу», «Гісторыя Расіі і Украіны». Міждысцыплінарныя сувязі двухбаковыя і носяць розны характар. У адных выпадках у межах «Канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў» згадваюцца факты, падрабязна вывучаныя ў межах іншай дысцыпліны, у другіх – падрабязна вывучаюцца працэсы, закранутыя пры вывучэнні іншых дысцыплін, у трэціх – інфармацыя тэарэтычнага характару, атрыманая пры вывучэнні сумежнага прадмета, напаўняецца канкрэтна-гістарычным сэнсам, у чацвёртых – адбываецца выкарыстанне і ўдасканальванне ўменняў, сфарміраваных пры вывучэнні іншай дысцыпліны.

**Мэта** выкладання вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» – праз засваенне і асэнсаванне вучэбнага матэрыялу садзейнічаць фарміраванню і развіццю ў студэнтаў навуковага светапогляду, падтрымліваць развіццё крытычнага і творчага мыслення, спрыяць фарміраванню сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучыць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у прафесійнай і сацыяльнай сферах.

**Задачы** выкладання вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў»:

- вызначэнне і вывучэнне асноўных тэндэнцый развіцця рэлігійных працэсаў на беларускіх землях у X–XVIII стагоддзях, даследаванне вылучаных перыядаў айчыннай канфесійнай гісторыі ў кантэксце агульнага развіцця грамадства і дзяржавы, паказ падзей айчыннай рэлігійнай гісторыі ў кантэксце агульнагістарычнага і агульнаеўрапейскага працэсу;
- развіццё ўменняў выкарыстання міждысцыплінарных сувязаў праз актуалізацыю ведаў і ўменняў па сумежных дысцыплінах (гісторыі Беларусі, гісторыі сярэдніх вякоў, гісторыі новага часу, гісторыі Расіі і Украіны);
- развіццё ўменняў усебаковага аналізу гістарычных фактаў. Напрыклад, развіццё уменняў вызначэння прычын і наступстваў гістарычных падзей адбываецца ў час вывучэння абставін «хрышчэння Русі», развіццё ўменняў адрознівання аб’ектыўнага і суб’ектыўнага, выпадковага і заканамернага ў гістарычных працэсах прасочваецца пры вывучэнні Брэсцкай уніі, развіццё ўменняў адрознівання формы і зместу гістарычных з’яў назіраецца пры разглядзе сутнасці верацярпімасці і г.д.;
- развіццё ўменняў самастойна здабываць інфармацыю, працаваць з гістарычнымі крыніцамі і спецыяльнай (манаграфічнай і даведачнай літаратурай), выкарыстоўваць атрыманыя веды для вырашэння інфармацыйна-пошукавых, навуковых і іншых задач.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

- асноўныя тэндэнцыі развіцця рэлігійных працэсаў на беларускіх землях у X–XVIII стагоддзях;
- асноўныя падыходы пры вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў;
- ролю і месца беларускіх зямель у канфесійнай гісторыі X–XVIII стагоддзяў;
- асноўныя факты канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў (падзеі, храналогію, персаналіі);
- спецыяльную тэрміналогію;

**умець:**

- выкарыстоўваць агульнагістарычныя прынцыпы аб’ектыўнасці і гістарызму пры вывучэнні і характарыстыцы канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў;
- карыстацца прынцыпам міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці пры вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў;
- аналізаваць і характарызаваць канфесійныя працэсы на Беларусі X–XVIII стагоддзях;
- працаваць з крыніцамі і спецыяльнай літаратурай пры вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стагоддзяў.

**валодаць:**

- сістэмнымі ведамі па канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст.;
- навыкамі і методыкай выкладання канфесійнай гісторыі Беларусі;
- катэгарыяльным апаратам і навыкамі працы з крыніцамі па канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст.;
- навыкамі гістарыяграфічнага і бібліяграфічнага аналізу.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» фарміруюцца наступныя прафесійныя **кампетэнцыі:**

- ПК-9. Фармуляваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у час навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці;
- ПК-10. Выкарыстоўваць патрэбныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і ствараць новыя метады даследавання, зыходзячы з канкрэтных задач.

Вучэбная дысцыпліна «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» вывучаецца студэнтамі дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі ў 6 семестры.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў» адводзіцца: агульная колькасць гадзін — 54, аўдыторных — 36, з іх лекцыі — 20 гадзін, практычныя заняткі — 16 гадзін. Самастойная работа студэнта — 20 гадзін.

Форма бягучай атэстацыі — залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Уводзіны ў канфесійную гісторыю Беларусі X–XVIII стст.**

Мэта і задачы вывучэння канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст. Гістарыяграфія пытання. Крыніцы па канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст.

**Тэма 2. Дахрысціянскія вераванні на Беларусі. Прыняцце хрысціянства.**

Паганства як гісторыка-рэлігійны феномен. Адметнасці беларускага паганства. З'яўленне хрысціянства на беларускіх землях.

**Тэма 3. Рэлігійныя працэсы на беларускіх землях у XI — першай палове XIII стагоддзя.**

Афармленне і развіццё царкоўнай арганізацыйнай структуры. Складванне і развіццё царкоўна-дзяржаўных і міжканфесійных адносін. Хрысціянізацыя. Дваяверства і «народнае праваслаўе».

**Тэма 4. Спецыфіка рэлігійных адносін у поліканфесійным грамадстве Вялікага княства Літоўскага.**

Узаемадзеянне рэлігійных плыняў і дзяржавы. Мадэль рэлігійных адносін. Талерантнасць і рэлігійная уніфікацыя: антаганізм і ўзаемны ўплыў

**Тэма 5. Праваслаўе і каталіцтва ў сістэме рэлігійных адносін Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII — сярэдзіна 80-х гадоў XIV стагоддзя).**

Змены геапалітычнай абстаноўкі ў першай палове XIII ст. і іх уплыў на рэлігійную сітуацыю. Місіянерская дзейнасць каталіцкага касцёла ў сярэдзіне XIII ст. і перспектывы праваслаўя. Праваслаўе і каталіцтва ў рэлігійнай палітыцы вялікіх князёў літоўскіх у пачатку 1380-х гг.

**Тэма 6. Рэлігійная уніфікацыі і верацярпімасць у канфесійным жыцці ВКЛ у сярэдзіне 80-х гадоў XIV — пачатку XVI стагоддзя.**

Упрывілеяванне каталіцкага касцёла і парушэнне балансу рэлігійных адносін. Станаўленне і развіццё арганізацыйнай структуры каталіцкага касцёла ў ВКЛ. Дзяржаўная палітыка ў дачыненні да праваслаўя і спробы нармалізацыі рэлігійнай сітуацыі. Радыкалізацыя і аптымізацыя рэлігійных адносін

**Тэма 7. Рэфармацыя і пашырэнне пратэстанцкіх плыняў у ВКЛ.**

Рэфармацыя як рэлігійны рух і грамадска-палітычная з'ява. Рэфармацыя ў ВКЛ: прычыны, перадумовы, асаблівасці. З'яўленне і распаўсюджванне пратэстанцкіх плыняў у ВКЛ.

**Тэма 8. Контррэфармацыя ў ВКЛ. Брэсцкая унія і паўставанне уніяцкай царквы. Кампраміс 1630-х гадоў.**

Контррэфармацыя ў ВКЛ. Праваслаўная царква ў другой палове XVI ст. Рэлігійныя адносіны ў 1550-х – першай палове 1590-х гадоў. Брэсцкая унія 1596 г. «Барацьба за царкву»: праваслаўна-уніяцкае ўзаемадзеянне на фоне дзяржаўнай палітыкі.

**Тэма 9. Рэлігійная сітуацыя на Беларусі ў 30-х гадах XVII — канцы XVIII стагоддзя.**

Рэлігійныя працэсы ў канцы 1640-х — 1660-х гадах. Наступствы вайны 1654–1667 гадоў. Узмацненне рэлігійнай уніфікацыі ў канцы 60-х гадоў XVII стагоддзя — першай палове XVIII стагоддзя. Рэлігійная сітуацыя ў другой палове XVIII стагоддзя.

## Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стагоддзяў»
## Дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Кіруемая самастойная праца студэнта | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **6 семестр** | | | | | | |
| Тэма 1 | Уводзіны ў канфесійную гісторыю Беларусі X–XVIII стст. | 2 | | | [6–8; 9–10] | |
| | Практычны занятак «Крыніцы і гістарыяграфія па канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст.» | | 2 | | [6–8; 9–10] | Тэст* |
| Тэма 2 | Дахрысціянскія вераванні на Беларусі. Прыняцце хрысціянства | 2 | | | [1; 5–8; 13–14] | |
| | Практычны занятак «Дахрысціянскія вераванні на Беларусі» | | 2 | | [1; 5–8; 13–14] | Вуснае апытанне. Абарона рэфератаў* |
| Тэма 3 | Рэлігійныя працэсы на беларускіх землях у XI — першай палове XIII стагоддзя | 2 | | | [6; 13–14; 19; 22] | |
| | Практычны занятак «Рэлігійныя працэсы на беларускіх землях у XI — першай палове XIII стагоддзя» | | 2 | | [6; 13–14; 19; 22] | Калоквіум |
| Тэма 4 | Спецыфіка рэлігійных адносін у поліканфесійным грамадстве Вялікага княства Літоўскага | 2 | | | [7; 9–10; 13; 15; 20; 22] | |
| Тэма 5 | Праваслаўе і каталіцтва ў сістэме рэлігійных адносін Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII – сярэдзіна 80-х гадоў XIV стагоддзя) | 2 | | | [7; 9–10; 13; 15; 20; 22; 26] | |
| | Практычны занятак «Праваслаўе і каталіцтва ў сістэме рэлігійных адносін Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII – сярэдзіна 80-х гадоў XIV стагоддзя)» | | 2 | | [7; 9–10; 13; 15; 20; 22; 26] | Вуснае апытанне. Абарона рэфератаў* |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Тэма 6 | Рэлігійная ўніфікацыя і верацярпімасць у канфесійным жыцці ВКЛ у сярэдзіне 80-х гадоў XIV – пачатку XVI стагоддзя | 2 | | | [7; 9–10; 13; 18; 20] | |
| | Практычны занятак «Рэлігійная ўніфікацыя і верацярпімасць у канфесійным жыцці ВКЛ у сярэдзіне 80-х гадоў XIV – пачатку XVI стагоддзя» | | 2 | | [7; 9–10; 13; 18; 20] | Падрыхтоўка анатаванага бібліяграфічнага спіса* |
| Тэма 7 | Рэфармацыя і пашырэнне пратэстанцкіх плыняў у ВКЛ | 2 | | | [8; 10–11; 13; 20] | |
| | Практычны занятак «Рэфармацыя і пашырэнне пратэстанцкіх плыняў у ВКЛ» | | 2 | | [8; 10–11; 13; 20] | |
| Тэма 8 | Контррэфармацыя ў ВКЛ. Брэсцкая унія і паўставанне уніяцкай царквы. Кампраміс 1630-х гадоў | 2 | | | [8–11; 13; 15; 17; 20] | |
| Тэма 8 | Контррэфармацыя ў ВКЛ. Брэсцкая унія і паўставанне уніяцкай царквы. Кампраміс 1630-х гадоў | 2 | | | [8–11; 13; 15; 17; 20; 23] | |
| | Практычны занятак «Брэсцкая унія і паўставанне уніяцкай царквы. Кампраміс 1630-х гадоў» | | 2 | | [8–11; 23] | Калоквіум |
| Тэма 9 | Рэлігійная сітуацыя на Беларусі ў 30-х гадах XVII — канцы XVIII стагоддзя | 2 | | | [8–11; 23] | |
| | Практычны занятак «Рэлігійная сітуацыя на Беларусі ў 30-х гадах XVII — канцы XVIII стагоддзя» | | 2 | | [8–11; 23] | Пісьмовае апытанне* |
| | **Агулам:** | **20** | **16** | | | |

* мерапрыемствы прамежкавага кантролю

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Бортнік, І. А. Канцэпцыя талерантнасці ў рэнесанснай сацыяльна-палітычнай думцы Беларусі, Літвы і Польшчы / І. А. Бортнік // Вестник Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – 2006. – № 1. – С. 70-76.

3. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 3 т. Тт. 1-3 / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2005-2010.

4. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: У 3 тамах. Т. 1. – Мінск : Белкартаграфія, 2009. – 244 с.

5. Гісторыя Беларусі: Падруч. У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я. К. Новік, Г. С. Марцуль, І. Л. Качалаў [і інш.] ; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 416 с.; іл.

6. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сяр. XIII ст. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с.; іл.

7. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 688 с.; іл.

8. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.)/ Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емяльянчык [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2004. – 344 с.; іл.

9. Марозава, С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.) / С. В. Марозава ; пад навук. рэд. У.М. Конана. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.

10. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура. (Філасофска-гістарычны аналіз). – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 111 с.

11. Падокшын, С. А. Іпацій Пацей: царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох / С. А. Падокшын. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 118 с. ; іл.

12. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 368 с.; іл.

13. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да кан. XVIII ст. / Г. Сагановіч. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.; іл.

**Дадатковая:**

14. Баравы, Р. Хрысціянізацыя тэрыторыі Полацкай і Тураўскай епархій (Гістарычна-геаграфічны аспект) / Р. Баравы // Беларускі гістарычны агляд. – 2003. – Т. 10, сш. 1 – 2. – С. 3–27.

15. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі ВКЛ / Ю. Бардах. – Мінск : В.а., 2002. – 459 с.

16. Батюшков, П. Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края / П. Н Батюшков. – Минск : БГУ, 2004. – 407 с.; ил.

17. Бортнік, І. А. Праблема талеранцыі ў дыскурсе контррэфармацыйнага руху на геакультурнай прасторы Беларусі, Літвы і Польшчы / І. А. Бортнік // Вестник Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1. – С. 94-102.

18. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе ВКЛ. Другая палова XIII – першая палова XVI ст. : вуч. дап. / П. Ф. Дзмітрачкоў. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 312 с.; іл.

19. Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды / М. І. Ермаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с.; іл.

20. Ермаловіч, М. І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. І. Ермаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Беллітфонд, 2003. – 448 с.; іл.

21. История религии: Учебник. В 2 т. Т. 2/ В.В. Виноградов, А. П. Забияко, З. Т. Лапина и др.; Под общ. ред. И. Н. Яблокова. – М.: Высш. шк., 2002. – 639 с.

22. Лыч Л. Хрысціянства ў этнакультурным жыцці Беларусі (ад старажытнасці да 1917 г.). – Віцебск : ВДТУ, 2005. – 220 с.

23. Саверчанка І. Брэсцкая царкоўная унія 1596 года: гістарычныя перадумовы і абставіны падпісання// Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 12. – С. 23–30.

24. Франциск Скорина и его время: Энцикл. справочник/ Редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 631 с.; ил.

25. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Тт. 1-6. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1993–2003.

26. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вуч. дапам. У 2 ч. Ч. 1. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 352 с.

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

1. Крыніцы і гістарыяграфія па канфесійнай гісторыі Беларусі X–XVIII стст.
2. Дахрысціянскія вераванні на Беларусі
3. Рэлігійныя працэсы на беларускіх землях у XI — першай палове XIII стагоддзя
4. Праваслаўе і каталіцтва ў сістэме рэлігійных адносін Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII — сярэдзіна 80-х гадоў XIV стагоддзя)
5. Рэлігійная уніфікацыі і верацярпімасць у канфесійным жыцці ВКЛ у сярэдзіне 80-х гадоў XIV — пачатку XVI стагоддзя
6. Рэфармацыя і пашырэнне пратэстанцкіх плыняў у ВКЛ
7. Брэсцкая унія і паўставанне уніяцкай царквы. Кампраміс 1630-х гадоў
8. Рэлігійная сітуацыя на Беларусі ў 30-х гадах XVII — канцы XVIII стагоддзя

## ПЕРАЛІК ТЭМ РЭФЕРАТАЎ

1. Падыходы да рэканструкцыі ўсходнеславянскага язычніцтва.
2. З'яўленне хрысціянства на беларускіх землях: легенды і факты.
3. Распаўсюджванне хрысціянства на Беларусі паводле археалагічных даных.
4. Асаблівасці пашырэння хрысціянства на Беларусі.
5. Рэлігійны фактар ва ўзаемаадносінах ВКЛ з заходнім светам (сярэдзіна XIII — 80-я гады XIV ст.).
6. Барацьба за асобную мітраполію як напрамак знешняй палітыкі вялікіх князёў літоўскіх у XIV ст.
7. Крэўская унія 1385 г. праз прызму канфесійнай гісторыі.
8. Агульназемскі прывілей 1387 г. у канфесійнай гісторыі Беларусі.
9. Гарадзельская унія 1413 г. праз прызму канфесійнай гісторыі Беларусі.
10. Трокскі прывілей 1434 г. у канфесійнай гісторыі Беларусі.
11. Фларэнтыйская унія 1439 г. і яе ўплыў на канфесійную сітуацыю ў ВКЛ.
12. Прывілей Казіміра 1447 г. праз прызму канфесійнай гісторыі Беларусі.
13. Прычыны і перадумовы Рэфармацыі ў ВКЛ.
14. Контррэфармацыя ў ВКЛ.
15. Полацкі езуіцкі калегіум.
16. Ордэн езуітаў на Беларусі (XVI–XVIII стст.).
17. Уніяцкая ідэя ў канцы XIV–XVI стст.
18. Статут ВКЛ 1588 г. праз прызму канфесійнай гісторыі Беларусі.
19. Прававое становішча духавенства паводле Статута ВКЛ 1588 г.

20. Прычыны і перадумовы Брэсцкай уніі.
21. Уніяцтва на Беларусі: выпадковасць, заканамернасць, альтэрнатыва.
22. Рэлігійная палеміка ВКЛ як крыніца па гісторыі міжканфесійных адносін.
23. Мялецій Сматрыцкі — дзеяч «на мяжы культур».
24. Іпацій Пацей — «архітэктар» уніі.
25. Падрыхтоўска і правядзенне Брэсцкага сабора 1596 г.
26. Віцебскае паўстанне 1623 г. у канфесійнай гісторыі Беларусі.
27. Іасафат Кунцэвіч.
28. Сымон Будны — ідэолаг рэфармацыйнага руху.
29. Канфесійная сітуацыя ў беларускіх землях ў час вайны 1654–1667 гг.
30. Канфесійная сітуацыя на беларускіх землях напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай.

## ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАЛІКУ

1. Гістарыяграфія гісторыі канфесій на Беларусі ў X – XVIII стст. дарэвалюцыйнага перыяду. Беларуская савецкая гістарыяграфія пытання.
2. Айчынная і замежная гістарыяграфія гісторыі канфесій на Беларусі ў X – XVIII стст. на сучасным этапе.
3. Беларускае паганства як гісторыка-рэлігійны феномен.
4. З’яўленне хрысціянства на беларускіх землях.
5. Станаўленне і развіццё арганізацыйнай структуры ўсходнехрысціянскай (праваслаўнай) царквы на Беларусі ў XI – сярэдзіне XIII ст.
6. Распаўсюджванне хрысціянства на Беларусі ў канцы X – XI ст.: спроба рэканструкцыі.
7. Хрысціянізацыя і дваяверства на Беларусі.
8. Складванне і развіццё царкоўна-дзяржаўных і міжканфесійных адносін на Беларусі ў XI – сярэдзіне XIII ст.
9. Спецыфіка рэлігійных адносін у поліканфесійным грамадстве ВКЛ.
10. Місіянерскай дзейнасць каталіцкага касцёла на Беларусі ў XI – сярэдзіне XIII ст.
11. Праваслаўе і каталіцтва ў рэлігійнай палітыцы ВКЛ у пачатку 1380-х гадоў.
12. Прывілей 1387 г. і яго наступствы: гісторыка-канфесійны аспект.
13. Станаўленне і развіццё арганізацыйнай структуры каталіцкага касцёла на Беларусі ў апошняй чвэрці XIV – XV ст.
14. Рэлігійны фактар пад час феадальнай вайые ў ВКЛ у 1430-х гадах.
15. Аптымізацыя рэлігійных адносін у ВКЛ пры Казіміры Ягелончыку і Жыгімонце І.
16. Рэфармацыя ў ВКЛ: прычыны, перадумовы, асаблівасці.
17. Пратэстанцкія плыні ў ВКЛ у XVI ст.

18. Контррэфармацыя ў ВКЛ.
19. Праваслаўная царква на Беларусі ў другой палове XVI ст.
20. Рэлігійныя адносіны на Беларусі ў 1550-х – першай палове 1590-х гадоў.
21. Уніяцкія ініцыятывы канца XIV – XV ст.
22. Падрыхтоўка і правядзенне Брэсцкага царкоўнага сабора.
23. Праваслаўна-уніяцкае супрацьстаянне на Беларусі ў 1596 – 1633 гг.
24. Станаўленне уніяцкай царквы ў ВКЛ у канцы XVI – першай палове XVII ст.
25. Рэлігійныя працэсы на Беларусі ў 1640-х – 1660-х гадах.
26. Уплыў ваенных канфліктаў сярэдзіны XVII – 20-х гадоў XVIII ст. на рэлігійную сітуацыю на Беларусі.
27. Канфесійная сітуацыя на Беларусі ў другой палове XVIII ст.
28. Дысідэнцкае пытанне і падзелы Рэчы Паспалітай.
29. Рэлігійны фактар у знешняй палітыцы ВКЛ і Рэчы Паспалітай.
30. Канфесіі этнічных меншасцяў на Беларусі.
31. Верацярпімасць і уніфікацыя ў рэлігійнай гісторыі Беларусі сярэдзіны XIII – XVIII ст.
32. Рэлігійныя адносіны ў ВКЛ у XV – XVIII стст.: гісторыка-прававы аспект.

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Мэта арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па дысцыпліне «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стст.» — садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны і фарміраванне самастойнасці як асобаснай рысы і важнага прафесійнага якасці, сутнасць чаго складаецца ва ўменні сістэматызацыі, планавання і кантролю сваёй дзейнасці. Задача самастойнай работы студэнтаў — засваенне адпаведных стандарту і праграме ведаў, уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне, замацаванне і сістэматызацыя атрыманых ведаў, іх выкарыстанне пры выкананні практычных заданняў і творчых прац, а таксама выяўленне прабелаў у ведах па прадмеце.

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай работы:

- самастойная праца з вучэбнай літаратурай для паглыбленага вывучэння асобных тэм;
- складанне анатаванага бібліяграфічнага спіса;
- падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах.

## Дадатковае інфармацыйнае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне самастойнай работы студэнтаў:

***А) Медыятэка кафедры гісторыі і турызму:***

1. матэрыялы, даступныя праз сістэму падтрымкі дыстанцыйнага навучання *GoogleClassroom.*

***Б) Інтэрнэт-рэсурсы:***

2. персанальны сайт інфармацыйна-метадычнай падтрымкі вучэбных дысцыплін выкладчыка В.У. Чараўко http://adverbum.org.

## Змест самастойнай работы студэнтаў (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| **Від самастойнай работы** | **Тэматычны змест і крыніцы, якія выкарыстоўваюцца** | **Колькасць гадзін** |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне асобных тэм вучэбнай дысцыпліны | Тэма 1. [6–8; 9–10] | 2 г. |
| | Тэма 2. [1; 5–8; 13–14] | 2 г. |
| | Тема 5. [7; 9–10; 13; 15; 20; 22; 26] | 2 г. |
| | Тэма 7. [8; 10–11; 13; 20] | 2 г. |
| Падрыхтоўка анатаванага бібліяграфічнага спіса | Тэмы 1–7. [1–26] | 2 г. |
| Падрыхтоўка рэферата | Тэма 2. [1; 5–8; 13–14]<br>Тэма 5. [7; 9–10; 13; 15; 20; 22; 26] | 10 г. |
| **Агулам:** | | 20 г. |

# КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Патрабаванні да студэнтаў: валодаць кампетэнцыі, ведамі, уменнямі, навыкамі ў аб'ёме, вызначаным дадзенай праграмай.

Дыягностыка якасці засваення ведаў, уменняў, навыкаў адбываецца ў форме прамежкавага кантролю і бягучай атэстацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў» (загад рэктара ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» № 294 ад 06.06.2014).

Мерапрыемствы **прамежкавага кантролю** адбываюцца на працягу семестра і ўключаюць наступныя формы кантролю:

1. тэст;
2. пісьмовае апытанне;
3. абарону рэфератаў;
4. падрыхтоўку анатаваных бібліяграфічных спісаў.

Вынік прамежкавага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале, уяўляе сабой сярэднеарыфметычную велічыню па выніках усіх мерапрыемстваў прамежкавага кантролю і разлічваецца па наступнай формуле:

$$П = \frac{Па+Т+Р+С}{n},$$

дзе П — вынік прамежкавага кантролю, Па — сярэдняя арыфметычная адзнака за пісьмовыя апытанні, Т — адзнака за тэст, Р — адзнака за рэферат, С — адзнака за анатаваны бібліяграфічны спіс, n — колькасць мерапрыемстваў прамежкавага кантролю.

У выпадку выканання ўсіх заданняў прамежкавага кантролю на станоўчую адзнаку (4–10 балаў), студенту выстаўляецца адзнака «залічана». У выпадку невыканання заданняў прамежкавага кантролю (у поўным аб'ёме або часткова) альбо пры выкананні іх на нездавальняючую адзнаку (1–3 балы) студэнт запрашаецца для здачы заліка ў пісьмовай форме. Адзнака «залічана» выстаўляецца пры адказе на станоўчую адзнаку (4–10 балаў).

# ХАРАКТАРЫСТЫКА (АПІСАННЕ) ІНАВАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ ДА ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «КАНФЕСІЙНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ X–XVIII стст.»

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Канфесійная гісторыя Беларусі X–XVIII стст.» адбываецца з выкарыстаннем наступных інавацыйных падыходаў:

- аўдыторныя заняткі праводзяцца з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій;
- для ацэньвання ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма;
- матэрыялы да заняткаў размяшчаюцца на базе платформы дыстанцыйнага навучання Google Classroom і на персанальным сайце інфармацыйна-метадычнай падтрымкі вучэбных дысцыплін выкладчыка В.У. Чараўко http://adverbum.org.

У ліку педагагічных методык і тэхналогій, што спрыяюць актывізацыі пазнавальнай творчай дзейнасці студэнтаў і набыццю імі вопыту самастойнага вырашэння задач, выкарыстоўваецца часткова-пошукавы метад, метад праблемнага навучання, камунікатыўныя тэхналогіі. Часткова-пошукавы метад рэалізуецца пры падрыхтоўцы рэферата і анатаванага бібліяграфічнага спіса. Метад праблемнага навучання рэалізуецца пры арганізацыі калоквіумаў. Камунікатыўныя тэхналогіі прадугледжваюць актыўнае абмеркаванне вучэбнага матэрыялу, дыскусію па ім. Яны знаходзяць выкарыстанне як пры абароне рэфератаў, так і ў час калоквіумаў.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Гістарыяграфія гісторыі Беларусі | Гісторыі і турызму | Няма | — |

Загадчык кафедры гісторыі і турызму,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт ______________ А.І. Корсак